інфармуюць адміністрацыю аб стане маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве, прапановах, просьбах і патрэбах людзей.

У мэтах аператыўнага інфармавання працоўных на прадпрыемствах горада актыўна выкарыстоўваліся розныя каналы: дні адкрытага пісьма, даведачныя службы, інфармацыйныя стэнды: «Разгледжана адміністрацыяй, партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацыямі», «Вы пытаеце — мы адказваем». Быў арганізаваны збор пытанняў, заўваг і прапаноў, якія вывучаліся і абагульняліся, аб прынятых мерах абавязкова дакладвалася. Такі падыход садзейнічаў пашырэнню галоснасці, умацаванню сувязі ідэйна-палітычнай работы з жыццём.

Партыйныя камітэты і арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў Мінска, Баранавіч, Наваполацка, Пінска і іншых гарадоў актыўна вядуць пошук новых форм масава-палітычнай работы, якія павялічваюць эфектыўнаць яе выхаваўчага ўздзеяння.

Абавязковай умовай далейшага ўдасканальвання масава-палітычнай работы з'яўляецца ўмацаванне дыферэнцыяльнага падыходу, пільны ўлік грамадскай думкі, інтарэсаў працоўнага калектыву, кожнага канкрэтнага чалавека. Жыццё рашуча патрабуе шукаць новыя формы, шляхі і сродкі вырашэння выхаваўчых задач.

[1] Постановление Пленума ЦК КПСС. М., 1988. С. 47.
[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 640, арк. 71.
[3] Гл.: Коммунист Белоруссии. 1980. № 6. С. 60.
[4] Гл.: Лебедев А. Д. Политическая работа в массах. Минск, 1983. С. 55.
[5] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 117, спр. 39, арк. 41.
[6] Гл.: Политический собеседник. 1987. С. 3.

А. Р. ШЛОПАК

## ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА РАЗВІЦЦЕМ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ РАБОЧЫХ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ (1971—1980)

Асноваіі стратэгічнага курсу перабудовы ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства Праграма КПСС вызначае навукова-тэхнічны прагрэс, актывізацыю чалавечага фактару, творчай дзейнасці мас [1]. Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу немагчыма без няспыннага пераўзбраення прадпрыемстваў на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі. Вырашэнне гэтых задач з'яўляецца справай актыўнай творчасці шырокіх рабочых мас, інжынераў, канструктараў, вучоных. У гэтай сувязі важнае практычнае значэнне мае вывучэнне мінулага вопыту дзейнасці партыйных арганізацый па развіццю актыўнасці рабочых у тэхнічным удасканаленні вытворчасці.

Улічваючы неабходнасць пераходу да інтэнсіўных метадаў развіцця эканомікі, XXIV з'езд КПСС у 1971 годзе вылучыў задачу арганічнага спалучэння дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі. Трэба было паскорыць комплексную механізацыю працаёмкіх работ у прамысловасці, асабліва дапаможных і падсобных, укараненне аўтаматызаваных вытворчасцей. Ажыццяўляць намечаныя задачы партыйным арганізацыям давялося ў складаных умовах нарастання застойных з'яў у эканоміцы і іншых сферах савецкага грамадства. Рэалізацыі важнейшых пераваг сацыялістычнага ладу — планавага развіцця эканомікі, разгортвання творчай ініцыятывы, спаборніцтва працоўных мас — перашкаджалі адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання, узмацненне ўраўнілаўкі, бюракратычных скажэнняў.

Аднак і ў тых умовах партыйныя арганізацыі Беларусі, апіраючыся на рашэнні партыі і ўрада, нямала зрабілі для павышэння ролі працоўных калектываў у тэхнічным пераўзбраенні вытворчасці. XXVII з'езд КПБ (люты 1971 года) вызначыў на дзевятую пяцігодку апераджальныя тэмпы росту электраэнергетыкі, хіміі і нафтахіміі, машынабудавання, прыборабудавання, электроннай, радыётэхнічнай галін. Трэба было ажыццявіць механізацыю важнейшых вытворчых працэсаў, а ўзровень механізацыі дапаможнай вытворчасці давесці да 65—70 % [2]. Шляхі вырашэння гэтых задач партыйныя камітэты абмяркавалі на пленумах, бюро, сходах партыйна-гаспадарчага актыву, у пярвічных арганізацыях. Каб рухаць навукова-тэхнічны прагрэс, важна было аб'яднаць намаганні вытворчых калектываў,

навукова-даследчых і канструктарскіх устаноў. Пераадоленню іх тэрытарыяльнай і ведамаснай раз'яднанасці дапамагалі створаныя на грамадскіх пачатках пры партыйных камітэтах буйных прамысловых цэнтраў — Мінска, Віцебска, Гомеля, Магілёва, Оршы — тэхніка-эканамічныя саветы, саветы садзейнічання навукова-тэхнічнаму прагрэсу і іншыя аб'яднанні спецыялістаў, вучоных, наватараў вытворчасці. З іх дапамогай выпрацоўваліся абгрунтаваныя рашэнні і рэкамендацыі па пытаннях НТП, павышэнню эфектыўнасці вытворчасці, распаўсюджанню перадавога вопыту.

Праблемы тэхнічнага ўдасканалення вытворчасці, умацавання яе сувязей з навукай, павышэння ў гэтай справе творчай актыўнасці рабочых мас пастаянна знаходзіліся ў полі зроку Мінскай гарадской партыйнай арганізацыі. На прадпрыемствах пачалі распрацоўвацца пяцігадовыя планы тэхнічнай рэканструкцыі. Гарадскі і раённыя саветы садзейнічання НТП, у якія, акрамя партыйных работнікаў, уваходзілі каля 100 доктараў і кандыдатаў навук, інжынеры і тэхнікі, эканамісты, наватары вытворчасці, распрацоўвалі рэкамендацыі па эфектыўнаму выкарыстанню навуковага патэнцыялу ВНУ і НДІ, умацаванню іх сувязей з прадпрыемствамі, скарачэнню тэрмінаў укаранення навуковых распрацовак у вытворчасць, аказвалі дапамогу ў распрацоўцы планаў тэхнічнага і сацыяльнага развіцця прадпрыемстваў. Творчы пошук на прадпрыемствах ператварыўся ў рух «У саюзе навукі з вытворчасцю кожнай распрацоўцы — высокую эфектыўнасць». Гэтаму садзейнічалі «дні навукі на вытворчасці», заняткі ў гарадской і раённых школах перадавога вопыту.

Прыклад пастаяннага клопату аб тэхнічнай мадэрнізацыі паказвалі камуністы падшыпнікавага завода. Тут абсталяванне абнаўлялася кожныя пяць гадоў. Разгортванне творчай актыўнасці рабочых і ІТР, укараненне новай тэхнікі, вырашэнне сацыяльных праблем партыйная арганізацыя вызначыла асноўнымі напрамкамі сваёй дзейнасці. Гэтыя пытанні рэгулярна абмяркоўваліся на партканферэнцыях, пасяджэннях парткома, сходах актыву, у цэхавых арганізацыях, партгрупах. Ход рэалізацыі перспектыўных і бягучых планаў тэхнічнага прагрэсу партыйны камітэт (сакратары М. П. Марозаў, В. К. Тапцоў) трымаў у полі зроку з дапамогай камісій па кантролю за ўкараненнем новай тэхнікі. У іх рабочыя-наватары, электрык І. В. Бахановіч, шліфоўшчык І. Б. Будоўскі, фрэзероўшчык Н. Ф. Радзько, слесары-рамонтнікі І. І. Караткевіч, І. М. Маліноўскі і іншыя супрацоўнічалі са спецыялістамі. На развіццё творчай ініцыятывы работнікаў былі сарыентаваны штогадовыя навукова-тэхнічныя канферэнцыі, а таксама ствараемыя для ўкараненняў новага абсталявання ў цэхах творчыя групы рабочых і спецыялістаў. Уздыму працоўнай і палітычнай актыўнасці калектыву садзейнічала распрацаваная парткомам агульная структура арганізацыі ідэйна-выхаваўчай работы. Удасканальваючы метады кіравання НТП, партком і дырэкцыя ўкаранілі комплексную праграму кіравання якасцю і эфектыўнасцю вытворчасці. У выніку ажыццяўлення ў 70-я гады другой і трэцяй рэканструкцый прадпрыемства ўзровень механізацыі і аўтаматызацыі ў асноўнай вытворчасці дасягнуў 94 %, а ў дапаможнай — 73 %. Калектыў паспяхова справіўся з заданнем дзевятай і дзесятай пяцігодак [3].

Тэхнічнае пераасняшчэнне вытворчасці інтэнсіўна праводзілася таксама на мінскіх аб'яднаннях імя У. І. Леніна, «Інтэграл», заводах ЭВМ, аўтамабільным, трактарным і іншых прадпрыемствах. У Мінскай гарадской партарганізацыі ўкараняўся, такім чынам, прынцып комплекснага падыходу да кіраўніцтва НТП — аптымальнае спалучэнне паўсядзённай дзейнасці з перспектыўным планаваннем павышэння тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, пастаянны клопат аб развіцці актыўнасці рабочых мас і спецыялістаў. У выніку ў дзесятай пяцігодцы прадукцыйнасць працы ў прамысловасці горада вырасла на 38 %, а на радзе прадпрыемстваў — у два-тры разы [4].

Добры вопыт набываўся таксама ў партарганізацыях Бабруйска, Віцебска, Оршы, Полацка, магілёўскіх заводаў «Электрарухавік», і аўтамабільнага, Лідскага завода электравырабаў. Для распрацоўкі планаў тэхнічнай рэканструкцыі з мінімальнымі капукладаннямі па вопыту Свярдлоўскай абласной партарганізацыі, адобранаму ў ЦК КПСС, на прадпрыемствах Гомеля па прапанове гаркома партыі (сакратар І. Грабянчук) стварылі ініцыятыўныя групы. У Віцебскай вобласці дзейснай формай партыйнага ўплыву з'явіліся ствараемыя па ініцыятыве партыйных камітэтаў штабы рэканструкцыі прадпрыемстваў. Яны аператыўна вырашалі арганізацыйныя пытанні, трымалі пад кантролем выкананне работ.

Даследаванне паказвае, што партыйныя арганізацыі Беларусі выступа-

лі ініцыятарамі распрацоўкі перспектыўных планаў навукова-тэхнічнага прагрэсу і сацыяльнага развіцця калектываў, прымянялі розныя формы і метады ўцягнення камуністаў, усіх рабочых і спецыялістаў ў ажыццяўленне тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемстваў, расшыраючы гэтым сацыяльную базу НТР. У авангардзе навукова-тэхнічнага прагрэсу ішлі камуністы, інжынерна-тэхнічныя сілы, вучоныя, найбольш кваліфікаваныя рабочыя-наватары. Аб'яднаныя ў камісіі, саветы, ініцыятыўныя групы і іншыя грамадскія фарміраванні пры партыйных камітэтах, яны былі апорай партыйнага кіраўніцтва развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу, ажыццяўленнем тэхнічнай рэканструкцыі. У разглядаемы перыяд на прадпрыемствах было ўстаноўлена 4467 механізаваных паточных і аўтаматычных ліній, комплексна механізавана і аўтаматызавана 2439 цэхаў і вытворчасцей і 74 прадпрыемствы, створана 111 АСУ [5]. Павысіўся тэхнічны ўзровень вытворчасці, палепшыліся ўмовы працы. Творчая актыўнасць рабочага класа стала важным фактарам тэхнічнага прагрэсу, развіцця прамысловасці, пацвярджала ленінскую думку аб тым, што «жывая творчасць мас — ...асноўны фактар новай грамадскасці»[6].

І ўсё ж патэнцыял творчай актыўнасці рабочага класа ў ажыццяўленні тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемстваў, мадэрнізацыі вытворчасці ў поўнай меры не выкарыстоўваўся. Затратны гаспадарчы механізм з адміністрацыйна-каманднымі метадамі кіравання ўсё больш станавіўся неўспрымальны да дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. У выніку некомплекснай рэканструкцыі прадпрыемстваў нарастала супярэчлівасць паміж укараненнем новай тэхнікі і няпоўным яе выкарыстаннем. Да прыкладу, у чэрвені 1979 года 5,2 % механізаваных паточных і больш 9 % аўтаматычных ліній давалі менш палавіны праектнай прадукцыйнасці [7]. Часам аўтаматычныя лініі не працавалі на поўную магутнасць з-за недахопу высокакваліфікаваных рабочых і спецыялістаў. У выніку навейшая тэхніка ўкаранялася, а прадукцыйнасць працы расла марудна, вельмі высокай заставалася ўдзельная вага ручной працы, фондааддача падала. Пераадолець супярэчанне магчыма толькі пры ўмове комплекснай аўтаматызацыі і механізацыі вытворчасці і апярэджваючай падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў.

Рэканструкцыя прадпрыемстваў не заўсёды вызваляла рабочых ад цяжкай ручной працы, што зніжала актыўнасць людзей. Міністэрствы, ведамствы, гаспадарнікі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі недаацэньвалі сацыяльна-эканамічнай значнасці вызвалення рабочых за кошт укаранення новай тэхнікі. Нярэдка адсталыя рашэнні закладваліся ў праекты будаўніцтва новых і рэканструкцыі старых заводаў і фабрык. Напрыклад, пасля завяршэння ў 1978 годзе рэканструкцыі Мінскага тонкасуконнага камбіната і гомельскага абутковага аб'яднання «Праца» узровень механізацыі працы не ўзрос, а знізіўся. Як адзначалася на XIX пленуме ЦК КПБ (верасень 1979 года), не атрымалі шырокага распаўсюджання станоўчы вопыт, эфектыўныя формы інтэграцыі навукі і вытворчасці. Многія партарганізацыі не вялі прынцыповай барацьбы з кансерватызмам і ведамаснасцю гаспадарнікаў. У выніку не выконваліся нават сціплыя планы ўкаранення новай тэхнікі. Так, у 1978 годзе на 131 прадпрыемстве не вяліся навукова-даследчыя работы і не ўкаранялася новая тэхніка. У Баранавічах у дзесятай пяцігодцы з запланаваных дзесяці прадпрыемстваў няпоўную рэканструкцыю правялі толькі пяць, хоць трэць працуючых была занята цяжкай ручной працай [8].

У сферы НТП усё больш сталі праяўляцца супярэчанні інтарэсаў розных груп работнікаў, калектываў, ведамстваў, арганізацый, іх бюракратычнага апарату. Часовыя, нярэдка своекарыслівыя і эгаістычныя патрэбнасці асобных работнікаў, груп людзей сутыкаліся з інтарэсамі калектываў, усяго грамадства. Так, калектыў Пінскага камбіната верхняга трыкатажу распрацаваў план рэканструкцыі вытворчасці ўласнымі сіламі пры мінімальных затратах і тэрмінах акупнасці. Аднак Мінлегпрам БССР (міністр Л. Н. Нагібовіч) не выдзеліў сродкаў на рэканструкцыю, больш таго, забраў у прадпрыемства яго ўласны фонд развіцця вытворчасці [9]. Тэхнічнае пераўзбраенне, укараненне прагрэсіўных форм арганізацыі вытворчасці аказаліся непрыймальнымі для ведамства, бо патрабавалі дадатковых намаганняў апарата, каб змяніць планы фінансавання, забеспячэння, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў. Акрамя таго, рэканструкцыя была звязана з пэўнай вытворчай рызыкай, што асабліва палохала бюракратаў.

Сур'ёзным тормазам на шляху тэхнічнага прагрэсу, творчай актыўнасці рабочых мас было манапольнае становішча асобных вытворцаў, канструк-

тарскіх і навуковых арганізацый. Такія калектывы гублялі цікавасць да перспектыўнага, сусветнага ўзроўню тэхнікі, вызначэння прыярытэтных напрамкаў НТП. Іх прадукцыя і без таго знаходзіла збыт. У такім становішчы аказалася аб'яднанне «Гомсельмаш», якое больш дзесяці гадоў выпускала цяжкія, складаныя ў эксплуатацыі і ненадзейныя кормаўборачныя камбайны КСК-100, на што не рэагавалі сур'ёзна Гомельскі абком і гарком партыі.

Прычыны, як бачым, былі і ў недахопах партыйнага кіраўніцтва: нарастаў фармалізм і бюракратызм, адсутнічалі публічнасць, дзейсная крытыка і самакрытыка, не хапала творчай ініцыятывы ў многіх пярвічных арганізацыях і партыйных камітэтах. Ініцыятыва і дзелавітасць нярэдка падмяняліся адміністрацыйным умяшаннем, агульнымі заклікамі, абяцаннямі, а творчы пошук — спробамі ў новых умовах прымяняць устарэлыя формы і метады. Аналіз дакументаў паказвае, што ў гады дзесятай пяцігодкі на партыйных канферэнцыях, пленумах, пасяджэннях парткомаў становішча з развіццём НТП усё больш уяўлялася ў «ружовых» колерах, са спасылкай на станоўчыя прыклады. Аб недахопах у большасці выпадкаў гаварылася мімаходзь. Сапраўднае становішча глыбока не аналізавалася, упушчэнні звычайна спрабавалі растлумачыць аслабленнем увагі партарганізацый да гэтых праблем.

Так, складваўся механізм тармажэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, які не дазволіў партыйным арганізацыям Беларусі ў поўнай меры рэалізаваць творчы патэнцыял рабочага класа ў тэхнічным удасканаленні прамысловай вытворчасці.

[1] Гл.: Программа КПСС: Новая редакция. М., 1986. С. 24, 26.
[2] Гл.: Материалы XXVII съезда КПБ. Минск, 1971. С. 91, 93—95, 116, 118.
[3] Гл.: Сов. Белоруссия. 1977. 17 мая; За технический прогресс. 1978. 14 нояб.; там жа. 1980. 15 февр.
[4] Гл.: Материалы XXIX съезда КПБ. Минск, 1981. С. 15.
[5] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г.: Статсборник. Минск, 1987. С. 46—49.
[6] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 35. С. 57.
[7] Гл.: Сов. Белоруссия. 1979. 21 нояб.
[8] Звязда 1979. 13 і 16 верасня; ПА Брэстскага АК КПБ. Ф. 1690, воп. 36, спр. 5, арк. 61—69; воп. 40, спр. 1, арк. 13—14.
[9] ПА Брэстскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 50, спр. 18, арк. 60, 61.

С. А. МАТОРАЎ

## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ЭКАНАМІЧНАЙ АДУКАЦЫІ РАБОЧЫХ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ (1976—1985)

Адным з важнейшых сродкаў выхавання ў кожнага працаўніка пачуцця гаспадара вытворчасці, фарміравання эканамічнага мыслення і сацыялістычнай прадпрымальнасці, павышэння дзелавітасці і арганізаванасці з'яўляецца сістэма эканамічнай адукацыі. На XXVII з'ездзе КПСС падкрэслівалася, што эканамічная адукацыя разам з палітычнай вучобай закліканы «узбройваць... працоўных уменнем палітычна стала мысліць і дзейнічаць, садзейнічаць распаўсюджанню і зацвярджэнню перадавых формаў арганізацыі працы і вытворчасці»[1]

У X пяцігодцы параўнаўча невялікая колькасць рабочых вывучала эканамічныя праблемы ў сістэме партыйнай і камсамольскай палітычнай вучобы, школах камуністычнай працы, пачатковых эканамічных школах. Так, на Мінскім заводзе халадзільнікаў яна складала ў 1977 — годзе 21,8 %; 1978 — 20,3; 1979 — 20,4 % колькасці рабочых. Дванаццаць эканамічных школ Мінскага завода «Ударнік» у 1979 годзе наведвалі 183 рабочыя, што складала 13 % рабочага калектыву прадпрыемства [2]. У сярэдніх і асабліва невялікіх вытворчых калектывах гэты паказчык быў яшчэ горшым, заняткі часта праходзілі на нізкім ідэйна-тэарэтычным і арганізацыйным узроўні.

Многія партыйныя арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў разглядвалі эканамічную адукацыю рабочых кадраў як штосьці другаснае ў сістэме ідэйна-выхаваўчай работы. На пасяджэнні партыйных бюро і камітэтаў, на партыйныя сходы рэдка выносілі пытанні, звязаныя з эканамічнай вучобай.